**Ільін, А. М.** «А пра вайну, бадай, не ўспамінаем…» / А. М. Ільін; гутарыў У. Міхно // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 2001. — 10 лют. — С. 2.

## «А ПРА ВАЙНУ, БАДАЙ, НЕ ЎСПАМІНАЕМ…»



*Пра такіх гавораць: ваенны да мозгу касцей. Фанат. Але ж фанатызм – гэта зусім не кепска. Вось бы ўсе былі фанатамі сваёй справы – наколькі б ад гэтага справа выйграла!*

*Ільін Аляксандр Міхайлавіч, начальнік другога аддзялення Чашніцкага РВК, былы «афганец». Зрэшты, чаму былы? «Афганец» – гэта як званне, ці то адмеціна – на ўсё астатняе жыццё.*

**– Як вы трапілі ў Афганістан, Аляксандр Міхайлавіч?**

–Як? Па загаду. Для нас, ваенных, загад – святое. Служыў у Бароўцы, у 18-м гвардзейскім танкавым палку. Фарміравалі ў Афганістан батальёны аховы. Так і трапіў у Джэлалабад, на ахову аэрадрома, намеснікам камандзіра роты.

**– Помніце свой першы бой?**

– Першы бой? Прыехалі – нас адразу і абстралялі, і ўвесь бой.

**– Напэўна ж, вы ў Афгане таксама гублялі сяброў?**

– Гублялі, а што пра гэта гаварыць? Зараз ужо не вернеш. У «духаў» кожная адзінка тэхнікі, кожны забіты чалавек – гэта грошы. Вось і стараліся яны.

**– Успомніце самі яркі эпізод з тае вайны.**

– Адзін быў эпізод, які доўжыўся два гады і чатыры месяцы.

**– У вас ёсць баявыя ўзнагароды?**

– Медаль «За баявыя заслугі».

**– За якія?**

– Ну, трэба было завезці ў аддалены батальён харчаванне, боепрыпасы. Ішла калона, мы суправаджалі, расчыстка дарогі, зачыстка...

**– Усё так будзённа: зачыстка-расчыстка, быццам ад снегу. Але ж, напэўна, пад кулямі?**

– Не, – усміхаецца, – снегу там, бадай, увогуле не было, хіба пад Новы год, а кулі – былі...

**– Слухайце, чаму вы, «афганцы», усе такія – самі ў сабе? Нешта з вас «выцягнуць» пра вайну – праблема. Пра што вы хоць гаворыце, сабраўшыся разам?**

– Пра ўсё. А пра вайну, бадай, не ўспамінаем. Не ведаю, можа, хто і ўспамінае, дзесьці там, на куханьцы, дома. Чаму мы такія? Вайна наклала свой адбітак.

**– І большасць «афганцаў» вельмі складана ўваходзіла ў мірнае жыццё. Вы хоць сустракаецеся?**

– Прыходзяць хлопцы ў ваенкамат з просьбамі: то тэлефон дапамагчы ўстанавіць, то па кватэрнаму пытанню. А што мы можам? Ні грошай, нічога няма. Хіба пагаварыць, супакоіць. Збіраемся 15 лютага, на Дзень памяці, на Дзень Перамогі, ходзім на могілкі, ускладваем вянкі.

**– У вас, гляджу, праца з моладдзю.**

– Так, вось ужо 13 гадоў. Зараз якраз прыпісная кампанія, прыходзяць падлеткі.

**– Што самае цяжкое ў працы з падлеткамі?**

– Знайсці кантакт з кожным з іх.

**– Ёсць сярод іх такія, хто не хоча ісці служыць? І як вы да іх ставіцеся?**

– Вядома, ёсць. Пакуль ідуць на прыпіску – усё нармальна, бо яшчэ дзеці. Ваенкамат... Рамантыка. А потым... Як стаўлюся? Ёсць пачуццё абавязку перад Радзімай...

**–Так, ёсць абавязак. Але ж і зразумець можна той страх перад невядомасцю ў гэтых падлеткаў і ў іх бацькоў.У арміі зараз рознае здараецца.**

– Армія – гэта адбітак нашага грамадства, у грамадстве таксама рознае здараецца. Дзедаўшчына? А вы былі ў вучылішчах, у іхніх інтэрнатах?..

**– Быў і ведаю, але розніца ў тым, што там ёсць выбар. Здзекуюцца з цябе – забірай дакументы. А з арміі нікуды не ўцячэш, хіба ў турму... Дарэчы, зараз таксама даводзіцца план прызыву?**

– Так, але па-іншаму. Дапусцім, я прыкідваю: з 360 прызыўнікоў па стану здароўя можна прызваць 150. Гэтыя рэальныя лічбы ідуць наверх, там абагульняюцца, і ўжо адтуль даводзіцца рэальны план. Да таго ж, зараз узмоцнена адказнасць за незаконны прызыў, таму ніхто не хоча потым плаціць грошы за салдата, якога камісуюць з арміі.

**– Што хочаце сказаць калегам-«афганцам» да свята?**

– Схіляю галаву перад памяццю загінуўшых і перад іх маці. А жывым – здароўя і цярплівасці.

**Гутарыў У. Міхно**